# БІБЛІЯТЭКА І БЕЛАРУСКАЯ КНІГА

Міністэрства культуры БССР разгледзела пытанне «Аб узмацненні прапаганды беларускай літаратуры і перыядычных выданняў у бібліятэках рэспублікі». Адзначана, што ў многіх з іх яна аслаблена. Недастатковая ўвага ўдзяляецца камплектацыі бібліятэк новымі творамі, слаба вядзецца работа з кнігамі, якія ёсць у наяўнасці, мала паступае беларускіх перыядычных выданняў.

З мэтай паляпшэння работы бібліятэк з беларускай літаратурай, рацыянальнага камплектавання і актыўнага выкарыстання беларускіх выданняў упраўленні культуры аблвыканкомаў і Мінскага гарвыканкома павінны прадугледзець у кожнай бібліятэцы штоквартальнае планаванне цыкла мерапрыемстваў па прапагандзе беларускай кнігі, выкарыстоўваючы найбольш эфектыўныя формы работы з чытачамі: прэм'еры кнігі, сустрэчы з пісьменнікамі, літаратурна-музычныя вечары, вечары паэзіі, гутаркі аб кнігах і г. д. Неабходна стварыць пры бібліятэках літаратурна-музычныя аб'яднанні, літаратурна-прапагандысцкія групы, клубы аматараў кнігі з удзелам абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў БССР, выкладчыкаў школ. Сумесна з Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР распрацаваць графікі сустрэч пісьменнікаў з чытачамі. Увесці ў практыку работы бібліятэк абласных, раённых цэнтраў таксама сустрэчы з работнікамі выдавецтваў, рэдакцый беларускіх часопісаў і газет, літаратурнымі крытыкамі.

Указана на неабходнасць расшырыць падпіску на беларускія перыядычныя выданні, прадугледзеўшы наяўнасць у сельскіх бібліятэках газет «Звязда», «Сельская газета», часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Неман», «Мастацтва Беларусі», «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі».

Бібліятэчная інспекцыя Міністэрства культуры БССР і Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна павінны забяспечыць планамерную работу бібліятэк па шырокай прапагандзе дасягненняў беларускай савецкай літаратуры і творчасці беларускіх празаікаў і паэтаў, прыняць меры па дакамплектаванні бібліятэчных фондаў патрэбнымі выданнямі беларускай літаратуры. Неабходна ўстанавіць строгі кантроль за якасным камплектаваннем бібліятэк творамі беларускай літаратуры і падпіскай на перыядычныя выданні. Прапанавана штогод праводзіць рэспубліканскія нарады па фарміраванні заказаў бібліятэк сумесна з работнікамі выдавецтваў і літаратурнымі крытыкамі.

Плануецца ў 1988 — 89 гадах правесці рэспубліканскі агляд-конкурс масавых бібліятэк па прапагандзе беларускай літаратуры, прысвечаны 70-годдзю ўтварэння БССР, Саюзу пісьменнікаў і Дзяржтэлерадыё БССР сумесна праводзіць штогоднія рэспубліканскія мерапрыемствы па прапагандзе беларускай літаратуры і тэлеперадачы аб творчасці беларускіх пісьменнікаў.

Сумесна з Дзяржкамвыдам БССР і рэспубліканскім праўленнем Добраахвотнага таварыства кнігалюбаў Бібліятэчная інспекцыя і Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна павінны сістэматычна вывучаць попыт чытачоў на творы беларускіх пісьменнікаў, актыўней уносіць прапановы па перавыданні кніг, якія карыстаюцца найбольшай папулярнасцю ў насельніцтва. Аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржбібліятэкі БССР імя У. І. Леніна павінен узначаліць работу па карэннай перабудове прапаганды беларускай літаратуры ў бібліятэках рэспублікі.

Рэспубліканскаму інстытуту павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры даручана ўвесці спецкурс па беларускай літаратуры для работнікаў бібліятэк у праграму абласных курсаў і інстытута.